УДК 9 (476)

# САМЫЯ ТРАГІЧНЫЯ СТАРОНКІ ВАЙНЫ СМАРГОНШЧЫНЫ

Дубок Г.А., БНТУ
кіраўнік: канд. гіст. навук, дацэнт Шчаўлінскі М.Б.

Вайна… Колькі трагедый, колькі болю, колькі жахаў… Вайна рушыць дзяржавы, знішчае народы, калечыць лёсы. Прайшло 65 год з тае пары, як скончылася Вялікая Айчынная вайна. Ужо 65 год мы жывём пад мірным небам. Ужо змянілася некалькі пакаленняў людзей. Мала засталося тых, хто вайну перажыў, а яшчэ менш тых, хто ваяваў. Ваявалі ўсё – дарослыя і дзеці, мужчыны і жанчыны. Ваяваў кожны куток нашай Радзімы. Калі пачынаеш гаварыць пра вайну – камок падступае да горла, з цяжкасцю стрымліваюцца слёзы. Але гэта абавязкова трэба зрабіць, каб непаўтарылася больш гэтая самая страшная трагедыя XX стагоддзя, каб з упэўненасцю глядзець у будучыню.

У сваёй рабоце мне хацелася расказаць пра самыя трагічныя і жахлівыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Смаргоншчыне. Смаргонскі раён быў акупіраваны немцамі ўжо на чацвёрты дзень вайны – 25 чэрвеня 1941г. Акупацыйны рэжым быў накіраваны на тое, каб ператварыць актыўную масу “іншароднага насельніцтва” ў напаўпісьменных рабоў. Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва. Аднак стварэнне гета, канцлагера, пазбаўленне жыцця бясконцага мноства людзей – усё гэта змог перажыць наш народ, змагла перажыць Смаргоншчына.

Мы перамаглі. Так і павінна было быць. Наш народ неператможны. Народ не здрадзіў сваёй Радзіме і ў гэты раз – ён абараніў яе, і ўсведамленне гэтага будзе жыць у сэрцах кожнага беларускага чалавека. Думаецца, што напярэдадні 65-годдзя Перамогі Смаргонь таксама дастойна ўспамінае сваіх сыноў і дачок і ўвекавечвае іх памяць.